


# І ЗНОЎ – У СВЕТ У ЛІДЗЕ

**ЛІДА. Чарговай літаратурнай сустрэчай у галоўнай кнігарні горада з удзелам гродзенскіх паэтаў адзначылі Сусветны дзень паэзіі.**

Нагадаем, што арганізатарамі літаратурнай гасцёўні «Выхад у свет» з'яўляюцца лідскія паэты Руслан і Святлана Піваваравы. Лакацыяй для правядзення на рэгулярнай аснове літаратурных мерапрыемстваў стала гандлёвая зала крамы «Книжный мир» (дырэктар Галіна Аляксандраўна Станевіч). Выступленні гасцей з Гродна тут сталі добрай традыцыяй. А сам праект унікальны, таму што гэта адзіная ў Гродзенскай вобласці вядомая нам кніжная крама, дзе выступаюць літаратары (напрыклад, у Мінску мерапрыемствы такога кшталту ладзяцца ў кнігарнях «Светач» і «Акадэмкніга»).

Сакавіцкая сустрэча пачалася з хвіліны маўчання ў памяць аб ахвярах жудаснага тэракту ў падмаскоўным «Крокус Сіці Холе». Тое, што адбываецца ў свеце, на вялікі жаль, паказвае, як чалавечае жыццё падае ў цане. А разам з жыццём у цане паніжаецца і яго праекцыя – слова. Неаднаразова адзначалася – калі так пойдзе і далей, сродкамі зносін людзей у будучыні стануць прымітыўныя ўмоўныя знакі (накшталт смайлікаў) і грубая сіла, улада зброі. Зразумела, пры такім раскладзе не можа ісці гаворкі пра дыялог – уменне чуць, прымаць суразмоўцу, разумець яго, адчуваць сябе часткай вельмі важнага і адказнага працэсу камунікацыі. Пакуль існуюць такія праекты, як літаратурная гасцёўня «Выхад у свет», дыялог у беларускім грамадстве будзе працягвацца, змястоўны і прынцыповы. Дыялог чалавека з чалавекам, дыялог пакаленняў і светапоглядаў. Дыялог, адным з удзельнікаў якога з'яўляецца мастацтва.





Па традыцыі на пасяджэнні літаратурнай гасцёўні прыходзяць лідскія пісьменнікі, педагогі, ветэраны працы, прадстаўнікі культурнай грамадскасці рознага ўзросту. Мерапрыемствы носяць адкрыты характар, – да аўдыторыі можа далучыцца любы наведвальнік кнігарні. Канцэптуальная асаблівасць праекта – удзел малавядомых аўтараў, у тым ліку пачаткоўцаў, адкрыццё новых імёнаў. «Выхад у свет» – гэта шлях з маленькай сціплай крыніцы ў вялікае літаратурнае плаванне. Гэты шлях нясе практычную карысць. Можна абмяняцца кнігамі, завязаць цікавыя знаёмствы, адзначыць разам важныя падзеі, паказаць сябе, праверыць свае рытарычныя здольнасці, уменне выступаць перад публікай, змястоўна і лаканічна прадставіць свой біяграфічны партрэт і сваю творчасць у строга абмежаваных часовых рамках. Нельга забываць і пра магчымасць пачуць у свой адрас здаровую крытыку, навык успрымання якой для прадстаўніка сферы мастацтва можна аднесці да абавязковых.

Гродзенскія паэты прыязджаюць сюды «выйсці ў свет» разам з калегамі з Ліды ўжо ў чацвёрты раз. 23 сакавіка ў літаратурную гасцёўню завіталі паэтэсы з Гродна Алена Марынец, Юлія Мельнік, а таксама пастаянны ўдзельнік лідска-гродзенскіх літаратурных сустрэч, член Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэт, публіцыст, літаратурны крытык Дзмітрый Радзівончык. Вядучы мерапрыемства – Руслан Піваварaў *(на фота).*



Напэўна, драматызмам, трывожным настроем у свеце можна растлумачыць той факт, што ў праграме прысвечанага Сусветнаму дню паэзіі літаратурнага мерапрыемства ў Лідзе пераважала сур'ёзная патрыятычная тэматыка. Менавіта яна прагучала ў творчасці беларускай паэтэсы, перакладчыка, аўтара песень Алены Марынец (*на фота*). Пераможца Міжнароднага фестывалю-конкурсу паэзіі і паэтычнага перакладу «Берега дружбы» (Растоўская вобласць, Расія), аўтар публікацый у перыядычным друку, працуе ў Гродзенскім абласным палацы творчасці дзяцей і моладзі, педагог, рэжысёр культурна-масавых мерапрыемстваў, з'яўляецца аўтарам кнігі – зборніка песень «Гарадзеншчына мая любая» (у суаўтарстве з гродзенскім кампазітарам Ірынай Траццяк). Гэтую кнігу паэтэса перадала ў дар літаратурнай гасцёўні «Выхад у свет», а таксама пазнаёміла слухачоў са сваімі перакладамі на беларускую мову лірыкі сучасных расійскіх

паэтаў і з перакладзенымі ў Расіі на рускую мову ўласнымі творамі. Цікавы факт: на адзін верш паэтэсы з Гродна стварылі мастацкія пераклады адразу некалькі расійскіх калег. На мінівыставе кніг гасцей былі прадстаўлены і выданні, якія Алена Марынец атрымала з Растоўскай вобласці, дзе ладзіцца буйны міжнародны форум паэтаў і перакладчыкаў паэзіі пад прыгожай сімвалічнай назвай «Берега дружбы».



Таксама з патрыятычнай (калі дакладна, з грамадзянска-патрыятычнай) лірыкі было складзена выступленне паэтэсы Юліі Мельнік (*на фота*). У мінулым годзе Юлія стала фіналістам II Міжнароднага літаратурнага конкурсу паэтычных перакладаў «Беларусь-Расія. Сожскія берагі дружбы» (Гомель, Беларусь), аўтар шматлікіх публіцыстычных артыкулаў на гістарычную, грамадска-палітычную тэматыку, працуе мытнікам. Піша пераважна па-руску, але ёсць і беларускамоўная паэзія. Нягледзячы на багаты жыццёвы вопыт, Юлія Мельнік, можна сказаць, толькі пачынае свой шлях да мастацкага слова, актыўна працуе над сабой, удзельнічае ў конкурсах, а таксама ў мерапрыемствах Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я. Карскага і ў праектах Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі. Паэтэса цікавіцца грамадскім жыццём, захапляецца стварэннем аўтарскіх паэтычных відэаролікаў, у якіх вельмі эфектна вобразна ўвасабляе сваё адчуванне навакольнага свету і ўнутранага свету сучаснай жанчыны.



Прадстаўнік СПБ Дзмітрый Радзівончык (*на фота*) выступіў з прысвечаным Сусветнаму дню паэзіі аўтарскім крытычным эсэ «После мраморов Каррары…» і павіншаваў прысутных з гэтым днём. Праграму пасяджэння літаратурнай гасцёўні працягнулі гаспадары, прычым як літаратары, так і чытачы, аматары і знатакі мастацтва. Уласныя лірычныя творы прадэкламавалі лідскія паэты: Руслан Півавараў, Святлана Піваварава, Людміла Русь, Алена Несцерава, Ігар Вербавік, Ала Юшко, Уладзімір Дронаў (1930 года нараджэння!), Валерый Мацулевіч, Вольга Верасняк, Ганна Рэлікоўская. З водгукамі на выступленні гасцей і цёплымі словамі сяброўскіх пажаданняў выступілі Вольга Высоцкая, Ніна Кобец і іншыя. Атмасфера ў «Выхадзе ў свет», як заўсёды, панавала вельмі дружалюбная. Вялікі дзякуй Валерыю Мацулевічу за вельмі дарагі падарунак – кнігу яго брата Алеся «Бронзавы Гедымін» (2024).

Кожны з удзельнікаў праекта знайшоў ад удзелу ў ім, ад яго наведвання нешта сваё, важнае для душы, каштоўнае для ўласнай свядомасці. І яшчэ. Пасля нядаўняга бліскучага выступлення Святланы і Руслана Піваваравых у Гродне можна канстатаваць, што супрацоўніцтва лідскіх і гродзенскіх літаратараў выходзіць на новы ўзровень і набывае выразныя рысы міжрэгіянальнага культурнага абмену.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**Гродзенскае абласное аддзяленне**






ПЕСНЯРАМ АЙЧЫНЫ
НАВСТРЕЧУ ПОПУТНОМУ ВЕТРУ
УЧУСЬ ГОВОРИТЬ


Гарадзеншчына мая любая
ПЕСНЯРАМ АЙЧЫНЫ
НАВСТРЕЧУ ПОПУТНОМУ ВЕТРУ
РЕКА БЕЗВРЕМЕННАЯ









**Святлана Піваварава** **Людміла Русь**






Ала Юшко



Вольга Верасняк




**Алена Несцерава**



**Уладзімір Дронаў**




**Валерый Мацулевіч**




**Ігар Вербавік**



**Выступае Ніна Кобец**



**Педагог-філолаг Вольга Высоцкая**



**Ганна Рэлікоўская**


Полезные сказки
ИГРУШКИ


ЗАМЕЖНАЯ
ЛІТАРАТУРА






*Фота*
*Дзмітрыя Радзівончыка,*
*Руслана Піваварава*
*і Святланы Піваваравай*